Добрыя мясціны трэба вышукаць,
Цішыню гарланнем не разбі.
Павуцінне – самай тонкай вышыўкі,
Папаратнік – дзіўнае разьбы.

Смольны пах.
Нагрэтыя сасонікі.
Ледзь трывожны гул.
Даспелы бор.
А суніцы, як малыя сонейкі,
У вясёлых плямках мухамор.

Гэта казка – пералескі раніцай,
Што ні крок – прасторней і пякней.
Толькі лесу можна нізка кланяцца,
І ніхто папрокам не ўпікне.

**П. Панчанка.** Годзе вам аб колькасці ды якасці...

5. Назавіце асноўныя стылістычныя адрозненні службовай аўтабіяграфіі ад літаратурнай. Знайдзіце іх прыклады. Якія моўныя сродкі характэрны для кожнай з гэтых аўтабіяграфій?

6. Як вы разумееце паняцце "слоўны вобраз"? Выпішыце некалькі прыкладаў слоўных вобразаў з газеты "Звязда". Чым слоўны вобраз адрозніваецца ад мастацкага? Прааналізуйце ў творах Уладзіміра Караткевіча сэнсавую градацыю пэўнага вобраза ад канкрэтнага да абагульненага. Параўнайце яе з вобразнымі сістэмамі іншых беларускіх пісьменнікаў.

Тэмы "Моўная кампазіцыя тэксту", "Вобраз аўтара", "Вобраз апавядальніка", "Суб'ектывацыя аповеду" будуць змешчаны ў наступным годзе.

*Факультатыўныя заняткі*

Алена БАГАМОЛАВА

# ЛЕКСІЧНЫЯ СРОДКІ ЭКСПРЭСІІ Ў МОВЕ МАСТАЦКАГА СТЫЛЮ

## НЕАЛАГІЗМЫ. ЛІНГВАСТЫЛІСТЫЧНЫ АНАЛІЗ МОВЫ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ

### Тэма "Неалагізмы"

Аўтарскія словы-наватворы як экспрэсіўныя сродкі мовы. Змест і функцыя неалагізмаў у мастацкім стылі.

### Заданні

➢ Прачытайце сказы. Назавіце аўтарскія неалагізмы, акрэсліце іх змест. Паразважайце, з якой мэтай аўтары выкарыстоўваюць словы з новай незвычайнай формай.

Ты ад маці, наша мова. І дзіця аб тым жа самым: першасловам, вечнасловам пракрычала свету: "Ма-ма!" (*К. Камейша*). Не для цароў венцаносных, абраннікаў Бога, а для цябе, светласэрцы мой люд чарнарукі (*Г. Бураўкін*). Не бачу я – прадбачу, не чую – а прадчуваю, не ведаю – а прадведваю... (*А. Разанаў*). І гэта крынічнасць, і гэта сунічнасць, вавёрка, і верас, і бор – зялёная сімвалічнасць, а шчасця ў жыцці недабор. Дык хто мы? Песняры ці хлусняры? (*П. Панчанка*). Маланкі стрэламі ўстаюць, у бубен сыпле гром... І я, захоплены, стаю, абдожджаны кругом (*П. Броўка*). Бо пра Айчыну думалі з табой, якую аніколі не пакінем, нібы лісты асіну ў лістабой. На лютнях зайграюць анёлы, і ўспыхнуцца ружы наўкол (*В. Шніп*). А вось і лета па Сібіру крочыць. Награліся, спацелі ланцугі. Цяжкія стомадні і стоманочы матаюць кайданы ў клубок тугі. Крычалі Сярдун, Згубікола і Зноўзадзярыўгорухвост (*Я. Сіпакоў*). Адгуло, адплыло маё лета вазамі – звонкарэхае, я не збярог (*Р. Барадулін*). Будзе год залаты, хлебадайны, трудны год ярыну абміне (*Я. Янішчыц*). Праз ранішні гоман стозыкі пасёлкаў і вёсак... Спяшаецца ўдалеч стары беларускі бальшак (*Н. Гілевіч*). Нібы матчыны рукі, знаёмым цяплом па шчацэ гладзяць спелыя травы, ахінае вей-ветрык празрыстым крылом, шэпча родныя словы ласкава (*С. Законнікаў*).

➢ Прачытайце. Знайдзіце індывідуальна-аўтарскія неалагізмы і скажыце, ад якіх слоў яны ўтварыліся. Падумайце, з якой мэтай дзіцячыя пісьменнікі выкарыстоўваюць словы-наватворы.

Аднаго хлопчыка празвалі Люлікам-Пілюлікам. Ён не засынаў, пакуль яго не палюляюць. А пілюлі глытаў ледзь не кожны дзень, бо часта хварэў (*У. Ліпскі*). Вось ён мячык-скачык, рассмяшу я мячык (*М. Маляўка*). А да Ланы – хоць ты плач – часта ходзіць Раскідач (*Р. Барадулін*). Дожджык, дожджык-грыбасей, не лянуйся: сей і сей (*С. Грахоўскі*). А жылі ў тым лесе зайцы-пагрызайцы (*А. Зянько*).

### Лінгвастылістычны аналіз мовы мастацкіх твораў

### Тропы

У адпаведнасці з засвоенай тэорыяй і набытымі практычнымі навыкамі навучэнцы павінны самастойна выканаць навуковыя працы ў выглядзе рэфератаў па акрэсленых тэмах.

1. Эпітэт, яго структурна-граматычнае выражэнне і функцыя ў кантэксце сучаснай беларускай паэзіі (Р. Барадулін, Г. Бураўкін, Н. Гілевіч, Л. Дранько-Майсюк, С. Законнікаў, У. Някляеў, А. Разанаў, В. Шніп і інш.).

2. Эпітэт у кантэксце сучаснай беларускай прозы: змест, структура і роля вобразнага азначэння (Я. Брыль, В. Быкаў, Л. Дайнека, Г. Далідовіч і інш.).

3. Эпітэт як сродак характарыстыкі ці самахарактарыстыкі персанажаў у кантэксце сучаснай драматургіі: граматычная роля і функцыя

тропа ў творах сучасных драматургаў (А. Дзялендзік, А. Дудараў, Л. Рублеўская і інш.).

4. Метафара, яе тыпы, структура і функцыя ў мове сучаснай паэзіі (А. Вярцінскі, Л. Галубовіч, В. Зуёнак, Н. Мацяш, У. Някляеў, А. Разанаў і інш.).

5. Метафара ў кантэксце сучаснай беларускай прозы (структурна-граматычнае выражэнне тропа і яго функцыя ў творах аднаго з аўтараў – У. Арлоў, В. Казько, В. Карамазаў, А. Кудравец і інш.).

6. Змест і функцыя метафары, метаніміі і сінекдахі ў драматургічным кантэксце (Р. Баравікова, М. Матукоўскі, Г. Марчук, А. Петрашкевіч і інш.).

7. Параўнанне як прадуктыўны сродак выразнасці мовы сучаснай паэзіі, яго структура і роля ў кантэксце твораў аднаго з аўтараў – М. Танк, А. Лойка, М. Мятліцкі, У. Някляеў, А. Разанаў, В. Шніп і інш.

8. Структурна-граматычнае выражэнне параўнання, яго змест і функцыя ў празаічным радку (Я. Брыль, В. Быкаў, І. Навуменка, І. Шамякін, У. Арлоў, Я. Сіпакоў, Л. Рублеўская і інш.).

9. Параўнанне як сродак забеспячэння характарыстыкі персанажаў у драматургічным кантэксце (А. Макаёнак, М. Матукоўскі, І. Чыгрынаў, У. Бутрамееў і інш.).

10. Перыфраза ў кантэксце мовы сучаснай паэзіі (структура і функцыя тропа на матэрыяле твораў аднаго з аўтараў – Н. Гілевіча, М. Танка, У. Някляева, А. Разанава, Я. Янішчыц і інш.).

11. Перыфраза ў мове сучаснай прозы: структура і функцыя апісальнай назвы ў кантэксце твораў, напрыклад, Я. Брыля, І. Навуменкі, Л. Дайнекі, У. Рубанава, Я. Сіпакова і інш.

12. Змест, структура і стылістычная афарбоўка перыфразы ў драматургічных творах (Р. Баравікова, У. Бутрамееў, А. Дудараў, А. Петрашкевіч і інш.).

13. Гіпербала і літота як спецыфічныя сродкі стварэння экспрэсіі ў драматургічным, паэтычным і празаічным кантэкстах (Г. Бураўкін, Н. Гілевіч, А. Глобус, А. Дзялендзік, А. Разанаў, Л. Рублеўская, В. Шніп і інш.).

### Лексічныя сродкі стварэння слоўнай экспрэсіі

1. Віды сінонімаў, іх тыпы і роля ў мове сучаснай паэзіі (С. Законнікаў, Н. Мацяш, М. Мятліцкі, У. Някляеў, А. Разанаў, В. Шніп і інш.).

2. Сінанімічныя рады, іх семантыка і функцыя ў празаічным радку (Г. Далідовіч, А. Жук, В. Карамазаў, А. Кудравец і інш.).

3. Значэнне і стылістычная роля сінонімаў у драматургічным кантэксце (А. Дудараў, Г. Марчук, А. Петрашкевіч, І. Чыгрынаў і інш.).

4. Антанімія як адметная з'ява мовы сучаснай паэзіі (М. Танк, А. Лойка, М. Мятліцкі, А. Разанаў, Л. Рублеўская, В. Шніп, Я. Янішчыц і інш.).

5. Роля антонімаў, іх структура, змест і стылістычныя прыёмы, заснаваныя на антаніміі, у празаічным радку (В. Быкаў, І. Шамякін, Л. Дайнека, Г. Далідовіч, А. Кудравец, Б. Сачанка, Я. Сіпакоў і інш.).

6. Стылістычная роля антонімаў у мове персанажаў драматургічных твораў (Р. Баравікова, У. Бутрамееў, А. Дзялендзік, А. Дудараў, Л. Рублеўская і інш.).

7. Амонімы, іх віды і роля ў мове сучасных паэтычных тэкстаў (М. Танк, С. Грахоўскі, Н. Гілевіч, Л. Галубовіч, А. Глобус, М. Мятліцкі, А. Пісьмянкоў, М. Скобла і інш.).

8. Стылістычная роля амонімаў у кантэксце сучасных празаічных і драматургічных твораў (Я. Брыль, К. Крапіва, У. Арлоў, Р. Баравікова, У. Бутрамееў, М. Матукоўскі, Я. Сіпакоў, М. Стральцоў і інш.).

9. Паронімы і іх месца ў мове мастацкіх твораў (Я. Брыль, П. Панчанка, Н. Гілевіч, Г. Бураўкін, А. Дудараў, Г. Марчук, М. Матукоўскі, Б. Сачанка і інш.).

10. Неалагізмы, іх змест і функцыя ў мове мастацкіх тэкстаў (Я. Брыль, Р. Барадулін, С. Грахоўскі, В. Акулін, А. Бадак, А. Дудараў, В. Казько, М. Матукоўскі, М. Мятліцкі, А. Пісьмянкоў, Я. Сіпакоў, І. Чыгрынаў і інш.).

### Літаратура

**Гаўрош Н.** Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы. – Мінск: Выш. шк., 1998.

**Грабчыкаў С.** Слоўнік паронімаў беларускай мовы. – Мінск: Нар. асвета, 1994.

**Клышка М.** Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. – Мінск: Нар. асвета, 1993.

**Лазоўскі У.** Слоўнік антонімаў беларускай мовы: Канкрэтныя выпадкі ўжывання. – Мінск: Універсітэцкае, 1994.

**Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы** / Пад рэд. А. Баханькова. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994.

**Малажай Г.** Сучасная беларуская мова: Слова. Перыфраза. Фразеалагізм. – Мінск: Выш. шк., 1992.

**Пазнякоў М.** Слоўнік эпітэтаў беларускай літаратурнай мовы. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988.

**Пісарэнка А.** Функцыянальная стылістыка беларускай мовы. – Мінск: БДУ культуры, 2003.

**Старычонак В.** Слоўнік амонімаў беларускай мовы. – Мінск: Выш. шк., 1991.

**Цікоцкі М.** Стылістыка беларускай мовы. – Мінск: Універсітэцкае, 1995.

**Юрэвіч А.** Стылістыка беларускай мовы. – Мінск: Выш. шк., 1983.

**Веселовский А.** Историческая поэтика. – Москва: Высш. шк., 1989.

**Виноградов В.** Поэтика русской литературы. – Москва: Наука, 1976.

**Голуб И.** Стилистика русского языка. – Москва: Рольф; Айрис-Пресс, 1997.

*У "Родным слове" змешчаны матэрыялы пра мастацка-вобразныя сродкі ў творах М. Танка (2003, № 5), У. Някляева (2004, № 7), Н. Гілевіча (2004, № 12), В. Шніпа (2004, № 5) – **А. Багамолавай**; Р. Барадуліна (2000, № 2), У. Жылкі (2000, № 5), У. Дубоўкі (2000, № 7), П. Панчанкі (2002, № 8), увогуле ў беларускай літаратуры (2004, № 2) – **В. Старычонка**; у паэзіі М. Багдановіча (2003, №№ 1, 4) – **І. Ламакі**; А. Разанава (2000, № 4) – **Т. Старасценкі**; Р. Барадуліна (1991, № 1) – **Н. Каўпак**.*

*Праграма і заданні па тэмах: "Эпітэт", "Параўнанне", "Метафара", "Перыфраза", "Гіпербала і літота", "Сінонімы", "Антонімы", "Амонімы", "Паронімы" былі надрукаваны ў №№ 7, 8, 10.*